Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МІФАЛОГІЯ

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для ўстаноў вышэйшай адукацыі*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках),напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05*
*Народная творчасць (фальклор)*

Мінск
БДУКМ
2014

**СКЛАДАЛЬНІК**
*Н. В. Матыліцкая,* старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*кафедра* тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка»;
*Т. В. Валодзіна,* загадчык аддзела фальклярыстыкі і культуры славянскіх народаў дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», доктар філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 12 ад 14.06.2012 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 24.09.2012 г.);
*навукова-метадычным* саветам па народнай творчасці Вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 2 ад 05.12.2012 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Н. В. Матыліцкая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма «Міфалогія» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках) (напрамкі спецыяльнасці 1-18 01 01-03 Народная творчасць (тэатральная), 1-18 01 01-04 Народная творчасць (народныя рамёствы), 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)).

Вучэбная дысцыпліна «Міфалогія» прадугледжвае вывучэнне беларускай міфалогіі ў кантэксце сусветнай міфалогіі як навукі пра мадэлі свету, якія выяўлены ў сукупнасці міфаў. Пры яе выкладанні выкарыстоўваюцца наступныя матэрыялы: гістарыяграфічныя працы, манаграфіі па асобных праблемах міфалогіі.

Засваенне дысцыпліны «Міфалогія» ўзаемазвязана з вывучэннем такіх дысцыплін, як «Гісторыя Беларусі», «Беларуская і сусветная літаратура», «Культуралогія», «Вусная народная творчасць», «Этнаграфія».

Выкладанне міфалогіі як вучэбнай дысцыпліны дазваляе сфарміраваць у студэнтаў глыбокія веды, выпрацаваць у іх аб’ектыўныя падыходы да ацэнкі з’яў духоўнай культуры беларускага народа.

*Мэта* дысцыпліны – пазнаёміць студэнтаў з сістэмай міфалагічных светапоглядных уяўленняў беларускага народа ў кантэксце сусветнай міфалогіі.

*Задачы:*

– засваенне студэнтамі тэрміналогіі вывучаемай дысцыпліны, азнаямленне з асноўнымі тэорыямі;

– раскрыццё асаблівасцей міфалагічнага мыслення, у аснове якога ляжаць асноўныя архетыпы;

– азнаямленне з класіфікацыяй вышэйшай і ніжэйшай міфалогіі, функцыямі вярхоўных багоў і дэманаў;

– усведамленне студэнтамі значэння беларускай міфалогіі як асновы народнай этыкі і маралі.

У выніку вывучэння дысцыпліны «Міфалогія» студэнт павінен *ведаць:*

– сістэму міфапаэтычнай спадчыны народа, ступені яе навуковага даследавання і запатрабаванасці ў сучаснай культуры;

– дакладную адрасацыю нематэрыяльнай культурнай спадчыны да этапаў старажытнай гісторыі Беларусі згодна Э. М. Загарульскаму;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сэнс міфалогіі як асновы народнай этыкі і маралі;

*умець:*

– творча падыходзіць да інтэрпрэтацыі беларускай міфалогіі ў будучай прафесійнай дзейнасці;

– папулярызаваць этнаэкалагічны змест традыцыйнай культуры ў працэсе арганізацыі, творчай дзейнасці з прадстаўнікамі розных узроставых груп;

– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях міфалогіі і сумежных з ёй дысцыплін;

*валодаць*:

– сучасным тэрміналагічным слоўнікам навуковай і народнай тэрміналогіі па міфалогіі;

– метадамі фіксацыі, вывучэння, архівізацыі і выдання этыялагічных тэкстаў традыцыйнай культуры;

– прыёмамі дакументавання этыялагічных тэкстаў традыцыйнай культуры.

Дысцыпліна «Міфалогія» мае светапоглядную, тэарэтычную і эстэтычную скіраванасць, прадугледжвае вывучэнне сутнасці і спецыфікі асноўных з'яў духоўнай культуры. Тэматычны план дысцыпліны падзелены на тры раздзелы. Кожны з іх складаецца з уступнай тэмы, тэм для тэарэтычнага і практычнага засваення.

Метады навучання ў межах дысцыпліны «Міфалогія» адпавядаюць агульным патрабаванням да фарміравання прафесійных кампетэнцый студэнта. Метадалагічную аснову выкладання складаюць: тлумачальна-ілюстратыўныя, рэпрадукцыйныя метады (лекцыя, тлумачэнне, дыскусія, дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў), праблемныя (дыялог, напісанне эсэ), метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі, напісанне рэфератаў), кантрольна-ацэначныя метады (адказы на семінарах, адказы на тэставыя заданні).

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай і вучэбнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны самастойна; валоданне навыкамі рэфератыўнага выкладання навуковага матэрыялу.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Міфалогія» ўсяго адведзена 218 гадзін, з якіх 114 гадзін – аўдыторныя заняткі (74 г. – лекцыі, 40 г. – семінары). Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік, экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | сем. |
| **Раздзел І. Міфалогія як навука** | | | |
| *Тэма 1.* Агульнае паняцце аб міфалогіі. Прадмет міфалогіі | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 2.* Формы старажытных вераванняў | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 3.* Белая і чорная магія ў традыцыйнай беларускай культуры | 2 | 2 | |
| *Тэма 4.* Міфапаэтычная мадэль свету | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 5.* Класіфікацыя міфаў | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Крыніцы для вывучэння міфалогіі | 2 | 2 | |
| *Тэма 7.* Гістарыяграфія беларускай міфалогіі | 2 | 2 | |
| *Тэма 8.* Хрысціянізацыя ўсходнеславянскіх зямель. Суіснаванне традыцый язычніцтва і хрысціянства | 2 | 2 | |
| **Раздзел ІІ. Вышэйшая міфалогія** | | | |
| *Тэма 9.* Вярхоўныя багі. Пантэон князя Уладзіміра | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 10.* Пярун – бог грому, маланкі і дажджу | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 11.* Дажбог – бог сонца | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 12.* Вялес – бог жывёлагадоўлі і земляробства | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 13.* Мокаш – багіня воднай стыхіі, жаночай працы і лёсу | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 14.* Лада – багіня прыгажосці і шлюбу | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 15.* Ярыла – бог маладога сонца і веснавой плоднасці | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 16.* Персаніфікацыя сонца ў час летняга сонцавароту: Купала | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 17.* Персаніфікацыя сонца ў час зімовага сонцавароту: Каляда | 3 | 2 | 1 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| **Раздзел III. Дэманалогія** | | | |
|---|---|---|---|
| *Тэма 18.* Паняцце і класіфікацыя дэманалогіі | 2 | 2 | |
| *Тэма 19.* Галоўны дэман – Люцыпар. Чорт | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 20.* Дэманічныя істоты прыроднай прасторы: вадзянік | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 21.* Дэманічныя істоты прыроднай прасторы: лесавік | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 22.* Дэманічныя істоты прыроднай прасторы: аржавеннік, балотнік, лознік і інш. | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 23.* Русалкі – духі воднай прасторы | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 24.* Дэманічныя істоты, звязаныя з жытлом і сядзібаю чалавека: дамавік | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 25.* Дэманічныя істоты, звязаныя з жытлом і сядзібаю чалавека: лазнік | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 26.* Дэманічныя істоты, звязаныя з жытлом і сядзібаю чалавека: гуменнік, хлеўнік, ёўнік і інш. | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 27.* Духі хвароб | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 28.* Дэманічныя істоты, якія маюць часткова чалавечую прыроду: вупыр | 3 | 2 | 1 |
| *Тэма 29.* Дэманічныя істоты, якія маюць часткова чалавечую прыроду: ваўкалак | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 30.* Хтанічны свет | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 31.* Міфалагічныя матывы ў мастацкай культуры Беларусі | 4 | 2 | 2 |
| Разам ... | 114 | 74 | 40 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Раздзел І. Міфалогія як навука

### *Тэма 1. Агульнае паняцце аб міфалогіі. Прадмет міфалогіі*

Вызначэнне тэрміна *міфалогія*. Міфалогія як сістэма ўяўленняў пра Сусвет. Асаблівасці міфалагічнага мыслення. Погляд К. Леві-Строса на міфалагічнае мысленне як на «прыроднае», а на сучаснае як на «прыручанае». Суадносіны міфалогіі і навукі: агульнае і адрознае. Два тыпы мыслення – міфалагічны і навуковы.

Міфалогія як навука. Азначэнне міфа. Міф як спосаб адлюстравання адносін чалавека і прыроды. Міф – ключ да сакральных ведаў.

Міфалагічная традыцыя – захавальніца свету ад глабальнай катастрофы. Сучаснае «экалагічнае мысленне» – процівага тэхнакратычнаму грамадству, грамадству спажывання. Стваральная сіла міфалогіі: фарміраванне маралі, светапогляду, стымуляванне творчасці. Міфалогія і сацыяльная практыка.

### *Тэма 2. Формы старажытных вераванняў*

*Анімізм* як тып светапогляду. Этапы развіцця анімістычных уяўленняў.

Персаніфікацыя з’яў прыроды (сонца, вада, камень, дрэва) і іх культ. Анімістычныя ўяўленні ў традыцыйнай беларускай культуры. Анімістычны светапогляд як аснова метафарызацыі мовы, паэтычнага паралелізму ў фальклоры.

*Татэмізм*. Жывёлы і птушкі – першапродкі. Рэшткі татэмізму ў беларускай абраднасці і вусна-паэтычнай творчасці. Беларускія казкі пра жывёл. Абрад Камаедзіца. Благавешчанне. Каляды.

Азначэнне *магіі*. Магія і рытуал. Тэарэтычная магія. Практычная магія. Віды магіі: імітатыўная і кантагіёзная магія. Магія і абрад. Магія колеру. Магія лічбаў. Магія імені. Вербальная магія. Замовы.

### *Тэма 3. Белая і чорная магія ў традыцыйнай беларускай культуры*

Чорная магія – зварот да злых духаў. «Паляванне на ведзьмаў» у часы інквізіцыі. Ведзьмы і ведзьмакі: спецыфічны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знешні выгляд. Розныя дзеянні ведзьмакоў на шкоду людзям. Шкода здароўю. Шкода ўраджаю: выкліканне ветру, буры, граду. Заломы ў жыце. Спосабы і сродкі нейтралізацыі шкодных уздзеянняў. Цяжкая смерць чорных варажбітоў.

Спагадлівыя знахары. Лекавая магія. Знахаркі-павітухі: магія ў практыцы цяжарнасці і родаў. Лячэнне ад начніцаў, крыксаў (неспакойны сон дзіцяці). Спосабы лячэння ад сурокаў. Вера ў «благія вочы» чалавека. Лячэнне дзяцей ад ліхаманкі. Замовы ад людской зайздрасці, ад ворагаў. Любоўная магія: прысушкі і адсушкі.

### *Тэма 4. Міфапаэтычная мадэль свету*

Узаемазалежнасць паняццяў макракосмасу і мікракосмасу.

Асноўныя параметры Сусвету – прасторава-часавыя, прычынныя, этычныя, колькасныя і семантычныя.

*Прасторава-часавыя параметры.* Сакральна абазначаныя кропкі прасторы – «сакральныя месцы» і часу – «сакральныя дні», «святы».

Рытуал як сродак асваення хаосу, пераўтварэння яго ў космас.

*Прычынныя параметры.* Паняцце меры, сусветнага закону, якім усё вызначаецца ў Сусвеце.

*Этычныя параметры.* Сферы добрага/злога, станоўчага/адмоўнага, дазволенага/забароненага і фіксацыя іх у практычных паводзінах.

*Колькасныя параметры.* Лічбавыя характарыстыкі Сусвету. Сакральныя лічбы. Неспрыяльныя лічбы як адлюстраванне вобраза хаосу.

*Семантычныя параметры.* Якасная структура свету. Супрацьпастаўленні (апазіцыі), якія апісваюць і арганізуюць свет.

Апазіцыі структуры прасторы: верх/ніз, неба/зямля, зямля/падзямелле, правы/левы, усход/захад, поўнач/поўдзень; апазіцыі часавых каардынат: дзень/ноч, вясна/зіма; апазіцыі колеравых характарыстык: белы/чорны, белы/чырвоны, чырвоны/чорны; апазіцыі сацыяльных і больш абагуленых характарыстык: мужчынскі/жаночы, свой/чужы, прыродны/чалавечы, доля/нядоля, жыццё/смерць, сакральны/свецкі.

Касмічнае кола як гарызантальная мадэль Сусвету. Сімволіка кола. Кола задыяка. Сімволіка круглых прадметаў (пярсцё-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нак, вянок і інш.). Салярная і месяцовая сімволіка ў беларускай народнай культуры. Каляда.

Касмічнае яйка як мадэль Сусвету. Яйка ў казках і абрадах. Сімволіка яйка ў хрысціянскай культуры. Сакральнае кола птушынага календара.

Гара як цэнтр Сусвету. Прыклады сусветнай гары ў розных народаў свету. Камень Алатыр у славянскім фальклоры. Курганная культура Беларусі. Міфалагічныя паданні, звязаныя з курганамі і камянямі.

Касмічнае дрэва як цэнтр і вось Сусвету. Дрэва ў сакральных тэкстах. Сімволіка крыжа. Віды крыжоў. Сімволіка дрэва ў беларускай народнай культуры: дуб, сасна, бяроза, вярба, таполя, каліна, рабіна і інш. Міфалагічныя расліны: папараць-кветка, разрыў-трава, браткі, іх сімволіка.

### *Тэма 5. Класіфікацыя міфаў*

Міжнародная і ўсходнеславянская сістэмы класіфікацыі міфаў.

Міжнародная сістэма: міфы касмаганічныя, этыялагічныя, эсхаталагічныя, астральныя, салярныя, месяцовыя, антрапаганічныя і інш. Усходнеславянская сістэма: міфы касмаганічныя, эсхаталагічныя і этыялагічныя.

*Касмаганічныя міфы* – міфы пра стварэнне свету. Міфы пра ўпарадкаванне космасу ў міфалогіях свету. Касмічны шлюб зямлі і неба. Змей як увасабленне касмічнай энергіі. Апазіцыя космас – хаос. Стварэнне свету як творчы акт Дэміурга. Стварэнне свету паводле Бібліі. Паняцце макракосмасу і мікракосмасу. Ідэя памірання/аднаўлення касмічнага парадку ў каляндарных абрадах.

*Эсхаталагічныя міфы* – міфы пра канец свету. Міфы пра патоп як найбольш распаўсюджаная ў свеце група эсхаталагічных міфаў. Шумера-акадскі міф пра патоп. Міф Платона пра Атлантыду. Хрысціянская эсхаталогія. Рэшткі міфаў пра патоп у беларускай традыцыйнай культуры. Вобраз яшчара як увасабленне воднай стыхіі.

### *Тэма 6. Крыніцы для вывучэння міфалогіі беларусаў*

*Пісьмовыя крыніцы*. Уласнабеларускія пісьмовыя крыніцы. «Слова пра паход Ігараў». Летапісы («Аповесць мінулых часоў», «Радзівілаўскі або Кёнігсбергскі летапіс»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Павучанні хрысціянскіх дзеячаў супраць язычніцтва (К. Тураўскі «Слова на антыпасху»).

Замежныя пісьмовыя крыніцы. Дакументы, створаныя замежнымі аўтарамі – гісторыкамі, падарожнікамі, місіянерамі аб побыце і вераваннях продкаў беларусаў (Я. Ласіцкі «Аб рэлігіі русінаў, маскавітаў і татар, вясельных і пахавальных абрадах, ежы, адзенні…», «Хроніка польская, літоўская і ўсёй Русі» М. Стрыйкоўскага).

*Фальклор* як багацейшая крыніца па міфалогіі беларусаў. Рэлікты міфалагічных уяўленняў у жанрах фальклору – замовах, абрадавых песнях, баладах, казках, галашэннях, дзіцячым фальклоры, легендах і паданнях, прыказках і прымаўках і інш.

*Этнаграфічныя крыніцы*. Міфалагічныя элементы ў каляндарных і сямейных абрадах. Міфалагічныя элементы ў прадметах народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: сімволіка арнаментаў, разьбы па дрэве і інш.

*Археалагічныя дадзеныя* як адна з найбольш дакладных крыніц. Пахаванні і язычніцкія капішчы, атрыбуты рытуалаў, абярэгі, прадметы побыту, адзення, упрыгожванні, якія маюць сакральную сімволіку.

*Мова і тапаніміка*. Этналінгвістыка як перспектыўная галіна навукі ў рэканструкцыі міфалагічнай сістэмы. Этымалагічнае і семантычнае вывучэнне міфонімаў. Тапаніміка і мікратапаніміка Беларусі. Тапонімы, звязаныя з міфалагічнымі ўяўленнямі.

*Культавыя камяні і крыніцы* і звязаныя з імі міфы. Прошча. Спалучэнне язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў у адпраўленні абрадаў.

### *Тэма 7. Гістарыяграфія беларускай міфалогіі*

Першае ўпамінанне пра пантэон багоў князя Уладзіміра (980, «Аповесць мінулых гадоў»). Праца Яна Ласіцкага «Пра рэлігію, ахвярапрынашэнні, вясельныя, пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў, татар…» (1582) – самая ранняя фіксацыя язычніцкіх вераванняў на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Міфалагічныя ўяўленні продкаў беларусаў у XVI ст. паводле «хронікі» М. Стрыйкоўскага.

Праца М. Чарняўскай «Рэшткі славянскай міфалогіі» (1817) – міфалагічныя ўяўленні, што захавала каляндарная абраднасць Магілёўшчыны. Л. Юцэвіч «Успаміны пра Жмудзь» (1842) і «Літва ў святле старажытнасцей» (1846) – апісанне рытуаль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных камянёў, язычніцкіх свяцілішч і міфалагічных рэшткаў у каляндарнай абраднасці.

Першая сістэмная характарыстыка міфалагічных персанажаў беларусаў – «Беларускія народныя павер'і» (1846) П. Шпілеўскага. «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў» (1895) А. Я. Багдановіча – першае асобнае даследаванне міфалогіі беларусаў. Уяўленні аб нячыстай сіле ў кнігах М. Я. Нікіфароўскага «Простанародныя прыкметы і павер'і» (1897) і «Нячысцікі…» (1907).

Міфалагічныя канцэпцыі ў працах М. М. Нікольскага «Міфалогія і абраднасць валачобных песень» (1931), «Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства» (1933), у зборніку А. Сержпутоўскага «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» (1930).

Праблемы беларускай міфалогіі ў працах сучасных даследчыкаў: Т. І. Шамякіна «Міфалогія Беларусі» (2000), А. М. Ненадавец «Сілаю слова: чорная і белая магія» (2002), С. І. Цярохін «Перунова цяпельца» (1993), Э. А. Ляўкоў «Маўклівыя сведкі мінуўшчыны» (1993), У. А. Васілевіч «Міфы Бацькаўшчыны» (1994), У. І. Коваль «Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы: даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі» (1995), Т. В. Валодзіна «Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў» (1999), Э. М. Зайкоўскі, Л. У. Дучыц «Жыватворныя крыніцы Беларусі» (2001), І. І. Крук «Сімволіка беларускай народнай культуры» (2003) і інш.

Энцыклапедычны слоўнік «Міфалогія Беларусі» (2004) – плён калектыўнай працы сучасных беларускіх даследчыкаў у галіне міфалогіі.

### *Тэма 8. Хрысціянізацыя ўсходнеславянскіх зямель. Суіснаванне традыцый язычніцтва і хрысціянства*

Місіянерская дзейнасць Андрэя Першазванага («Андрэева легенда»). Дамоўленасць кіеўскага князя Ігара з грэкамі. Хрышчэнне Вольгі – жонкі Ігара. Сватанне князя Уладзіміра да Рагнеды, полацкай князёўны. «Крывавае вяселле». Паход Уладзіміра на Кіеў і забойства Яраполка. Княжанне Уладзіміра на кіеўскім пасадзе. Ваенныя і рэлігійныя рэформы. Пантэон князя Уладзіміра (980). Язычніцкае свяцілішча ў Ноўгарадзе.

«Выпрабаванне веры»: мусульманскія, заходнехрысціянскія і іўдзейскія місіянеры ў Кіеве. Зварот візантыйскага імператара

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Васілія II да князя Уладзіміра. Прычыны хрысціянізацыі. Хрышчэнне кіяўлян (988). Летапісныя сведчанні пра звяржэнні язычніцкіх стодаў у Кіеве і Ноўгарадзе. Адносіны да хрысціянізацыі ў розных слаях грамадства. Замах Рагнеды на Уладзіміра. Рагнеда і Ізяслаў на радзіме: заснаванне горада Ізяслаўля (сучаснае Заслаўе). Увядзенне хрысціянства ў Полацкім княстве. Прыняцце манаства Рагнедаю. Дзейнасць Ізяслава Уладзіміравіча ў Полацку. Далейшая хрысціянізацыя беларускіх зямель.

Двухвер'е. Крытэрыі «перакладу» імён язычніцкіх багоў на імёны хрысціянскіх святых.

Беларускі народны каляндар як адлюстраванне сінтэзу дзвюх традыцый.

## Раздзел II. Вышэйшая міфалогія

### *Тэма 9. Вярхоўныя багі. Пантэон князя Уладзіміра*

Паняцце вышэйшай і ніжэйшай міфалогіі, адрозненне паміж імі. Пантэон вярхоўных багоў.

Сварог – бог агню, неба, прабог усіх багоў. Этымалогія імені. Упамінанне Сварога ў пісьмовых крыніцах. Эпоха Сварога – пачатак апрацоўкі металаў і ўстанаўлення манагаміі. Сварог як бог шлюбу, кавальства і хлебаробства. Сімвалічная выява Сварога – крыж.

### *Тэма 10. Пярун – бог грому, маланкі і дажджу*

Пярун – вярхоўны бог грому, маланкі, агню і дажджу. Упамінанні Перуна ў летапісах. Стод Перуна ў пантэоне князя Уладзіміра. Этымалогія імені. Галоўныя функцыі Перуна. Знешнасць Перуна ва ўяўленнях беларусаў. Урочышча Перынь пад Ноўгарадам. Археалагічныя рэшткі (капішчы, стоды, культавыя камяні) у Беларусі. Моўныя сведчанні (назвы вёсак, урочышч, рэк) пра ўшанаванне Перуна. Рэканструкцыя «асноўнага міфа» славян аб барацьбе Перуна і Вялеса.

Перуновы стрэлы і іх функцыі ў абрадах і народнай медыцыне. Абрад Ваджэнне і пахаванне стралы – лакальны апатрапеічны рытуал, засцярога ад маланкі.

Замена Перуна святым Іллём з увядзеннем хрысціянства. Жыццё св. Іллі паводле Свяшчэннага Пісання. Ілля ў традыцыйных уяўленнях беларусаў. Дзень Іллі ў беларускай тrады-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыі. Народная абраднасць, прыкметы, павер'і, прыказкі, прымаўкі, заклінанні, замовы, звязаныя з днём Іллі.

### *Тэма 11. Дажбог – бог сонца*

Дажбог – бог сонца, даравальнік розных даброт. Упамінанне Дажбога ў летапісах. Дажбог у пантэоне князя Уладзіміра. Дажбог – сын Сварога. Этымалогія імені. Рэшткі культу Дажбога ў Беларусі. Дажбогаў камень і звязаны з ім абрад выклікання дажджу. Дажбог у народных песнях як даравальнік здароўя, мудрасці, майстэрства. Легенда пра нараджэнне Дажбога паводле версіі А. Кіркора.

### *Тэма 12. Вялес – бог жывёлагадоўлі і земляробства*

Упамінанні Вялеса ў летапісах («Нестараў летапіс»). Параўнанне Вялеса з багамі розных міфалогій свету (літоўскі Вяльнес, латышскі Велс, кельцкі Велуан, індыйскі бог Варуна і дэман Вала і інш.).

Імя Вялеса ў беларускай тапаніміцы і антрапаніміцы. Камяні, звязаныя з культам Вялеса («Вол», камяні-«краўцы» і камяні-«шаўцы»). Зааморфныя коды Вялеса – мядзведзь, воўк, бык (вол), змяя. Абрад Камаедзіца як праява культу мядзведзя, ушанаванне Вялеса, як апякун паляўнічых. Абрад Дажынкі – завіванне «Вялесавай барады».

Святы Улас і святы Мікалай – заменнікі Вялеса пасля прыняцця хрысціянства. Дзень святога Уласа ў беларускай традыцыі. Урачысты абрад абароны і шанавання хатняй жывёлы. Заклінальны характар абраду Выгнанне каровінай смерці.

### *Тэма 13. Мокаш – багіня воднай стыхіі, жаночай працы і лёсу*

Мокаш – вышэйшае жаночае боства ў старажытнаславянскім пантэоне. Упамінанне Мокашы ў пісьмовых крыніцах. Этымалогія імені. Адлюстраванне імені Мокашы ў беларускай тапаніміцы і анамастыцы. Знешні выгляд Мокашы ва ўяўленнях славян.

Разнастайнасць функцый Мокашы: багіня дажджу, вільгаці, апякунка крыніц; хатняй жаночай работы (прадзення, ткацтва); багіня лёсу. Макрыды – абрад, звязаны з культам Мокашы.

Культ Параскевы Пятніцы, апякункі жаночай працы, крыніц, калодзежаў, памерлых душ, маладзёжных ігрышчаў, дзявочага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лёсу. Свята Параскевы і звязаныя з ім у народзе павер'і. Дванаццаць пятніц-свят. Вячоркі – традыцыйны спосаб знаёмства маладых людзей, выбару шчаслівых пар.

### *Тэма 14. Лада – багіня прыгажосці і шлюбу*

Этымалогія імені. Партрэтныя характарыстыкі Лады паводле народных уяўленняў. Культ Лады, засведчаны царкоўнай літаратурай. Упамінанне пра храм Лады, пабудаваны ў Кіеве.

Веснавыя святы, звязаныя з ушанаваннем Лады. Імя Лады ў песнях абраду Гуканне вясны. Беларускі міф пра Ладу як пра жонку Дажбога.

Лель і Палель – сыны Лады і Дажбога. Іх знешні выгляд і функцыі. Ляля – дачка Лады. Абрад Ляльнік – адметны абрад беларусаў.

### *Тэма 15. Ярыла – бог маладога сонца і веснавой плоднасці*

Ярыла ва ўяўленнях беларусаў. Этымалогія імені. Культ Ярылы. Ярылін тыдзень. Абрад Ярылкі ў расійскай традыцыі. Пахаванне Ярылы. Аргаістычны характар абраду.

Святы Юрый – пераемнік Ярылы. Святы Юрый у Свяшчэнным Пісанні. Юр'я ў беларускай тапаніміцы і антрапаніміцы.

Абрад Юр'я ў беларускай традыцыі. Звычай выгану жывёлы на Юр'еву расу. Звычай абыходу поля на Юр'еў дзень. Пастухоўскія гульні. Магічныя абрады і павер'і, звязаныя з гэтым звычаем. «Тураўскі карагод» – лакальная традыцыя святкавання дня Юр'я на Тураўшчыне. Павер'і, звязаныя з актывізацыяй ведзьмаў у дзень Юр'я і спосабы абароны ад іх уздзеяння.

Міфалагічныя элементы ў юраўскіх песнях. Хрысціянізацыя некаторых песенных матываў. Вобраз маці Юр'я – рэшткі язычніцкага жаночага культу.

### *Тэма 16. Персаніфікацыя сонца ў час летняга сонцавароту: Купала*

Этымалогія імені. Абрад Купалля. Магія агню і вады. Сімволіка запаленага кола. Варажба. Уяўленні пра «ігру сонца». Вобраз Купалінкі ў абрадзе і ў песні. Сімволіка папараць-кветкі. Міфалагічны персанаж Купальскі дзядок. Актывізацыя дэманічных сіл і абярэгі ад іх. Заклінальныя купальскія песні. Хрысціянізацыя абраду Купалля.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 17. Персаніфікацыя сонца ў час зімовага сонцавароту: Каляда*

Этымалогія імені. Абрад Каляд. Тры куцці. Сімволіка колькасці абрадавых страў. Ачышчальная магія. Аграрная магія. Культ продкаў. Варажба на будучы ўраджай і на будучы лёс. Павер'і і прыкметы, звязаныя з перыядам Каляд. Хаджэнне калядоўшчыкаў па хатах. Старажытныя вытокі персанажаў абрадавага ігрышча – казы, каня, мядзведзя, бусла, дзеда. Міфалагічны персанаж – Шчадрэц.

## Раздзел III. Дэманалогія

### *Тэма 18. Паняцце і класіфікацыя дэманалогіі*

Азначэнне дэманалогіі. Былічкі – жанр фальклору, які адлюстроўвае ўяўленні беларусаў аб дэманічных істотах.

Рэшткі дэманалагічных уяўленняў у сучасным сямейным і грамадскім побыце.

Версіі народных уяўленняў аб паходжанні дэманічных істот. Класіфікацыя дэманалогіі паводле М. І. Талстога. Класіфікацыя дэманічных істот, прынятая ў беларускай навуцы.

### *Тэма 19. Галоўны дэман – Люцыпар. Чорт*

*Шатан* (Сатана) – галоўны дэман. Свяшчэннае Пісанне аб паходжанні Сатаны. Шатан (Анчыпар, Люцыпар) паводле народных уяўленняў. Яго знешняе аблічча, паводзіны.

*Чорт.* Розныя назвы чорта. Уяўленні народа пра знешні выгляд гэтага нячысціка. Формы пераўтварэння чорта. Яго месцазнаходжанне. Рэгіянальная палеская разнавіднасць чорта – смаляны чорт і асаблівасці яго паводзін. Спосабы ўбачыць чорта. Шкодніцтвы чорта і абярэгі ад іх. Сувязь чорта з чалавекам. Сямейнае становішча чарцей.

### *Тэма 20. Дэманічныя істоты прыроднай прасторы: вадзянік*

*Вадзянік* – дух увасаблення разбуральнай стыхіі вады. Гаспадар вадаёма. Знешні выгляд вадзянікоў. Віды вадзянікоў: вірнікі, ціхоні. Перыяды найбольшай актыўнасці вадзянікоў. Прычыны і спосабы іх шкоды людзям. Звычаі ахвяравання вадзянікам. Адносіны млынароў і пчаляроў з вадзянікамі. Сямейны лад. Прычыны гібелі вадзянікоў. Паводзіны вадзянікоў на свята Вадохрышча. Абярэгі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 21. Дэманічныя істоты прыроднай прасторы: лесавік*

*Лесавік* – дух лесу. Шматлікія назвы лесавіка. Месцапражыванне. Уяўленні аб знешнім выглядзе лесавіка. Лесавік як гаспадар лесу: яго функцыі і паводзіны ў сваіх уладаннях. Прычыны дваістага стаўлення да лесавіка: шкода / дапамога чалавеку. Ахвяры лесавіку. Зааморфныя ўвасабленні лесавіка. Сямейны лад. Уяўленні пра лесавую бабу.

### *Тэма 22. Дэманічныя істоты прыроднай прасторы: аржавеннік, балотнік, лознік і інш.*

*Балотнік* – дух, які жыве ў балоце. Знешні выгляд. Спосабы прываблівання і авалодвання ахвяраю. Прычыны гібелі балотнікаў.

*Аржавеннік* – дух, які жыве ў аржавеннях, багністых мясцінах колеру іржы. Знешні выгляд. Спосабы завалодвання ахвяраю.

*Лознік* – дух-насельнік лазняку. Знешні выгляд. Спосабы завалодвання ахвяраю. Прычыны гібелі лознікаў.

### *Тэма 23. Русалкі – духі воднай прасторы*

*Русалкі* – дэманічныя істоты жаночага роду, насельніцы азёр і рэк. Генезіс вобраза русалкі. Берагіні і старажытны абрад маленняў аб дажджы – Русаллі. Этымалогія імені. Прычыны пераўтварэння ў русалак. Адрозненні паміж няхрышчанымі і хрышчанымі русалкамі. Шматстайнасць уяўленняў пра знешні выгляд русалак. Шкодныя дзеянні русалак і абярэгі ад іх. Дапамога русалак чалавеку. Месцазнаходжанне русалак у розныя поры года.

Русальны (Граны) тыдзень. Семантыка этапаў абраду Провады русалкі. Варажба: звычай завівання і развівання вянкоў. Вобраз русалкі ў песнях і карагодах русальнага тыдня.

### *Тэма 24. Дэманічныя істоты, звязаныя з жытлом і сядзібаю чалавека: дамавік*

Выбар месца і часу будаўніцтва хаты ў беларусаў. Ахвяраванне пры закладцы хаты. Міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з новым жыллём. Хата як мікрамадэль Сусвету. Міфалагізацыя розных частак хаты: страхі, вокнаў, дзвярэй, печы, покуці. Духі жытла і сядзібы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дамавік* – дух, які жыве ў хаце. Знешні выгляд. Месцазнаходжанне. Рэгіянальныя назвы дамавіка. Яго функцыі. Сям'я. Матывацыя пазітыўных і негатыўных паводзін дамавіка. Абярэгі. Свята, звязанае з ушанаваннем дамавіка.

### *Тэма 25. Дэманічныя істоты, звязаныя з жытлом і сядзібаю чалавека: лазнік*

*Лазнік* – дух, які жыве ў лазні. Правілы паводзін чалавека ў адносінах да лазніка.

### *Тэма 26. Дэманічныя істоты, звязаныя з жытлом і сядзібаю чалавека: гуменнік, хлеўнік, ёўнік і інш.*

*Хлеўнік* – дух, які жыве ў хляве. Матывацыя яго дэструктыўнай дзейнасці.

*Гуменнік* – дух, які жыве ў гумне. Знешні выгляд. Паводзіны гуменніка.

*Ёўнік* – дух, які жыве ў ёўні. Матывацыя паводзін ёўніка. Ёўнік як памочнік у сельскагаспадарчай працы.

### *Тэма 27. Духі хвароб*

Персаніфікацыя хвароб чалавека. Антрапаморфны выгляд (воспа, ліхаманка, халера). Суаднесенасць хвароб з нячыстай сілай, смерцю. Хвароба як міфалагічная ідэя парушэння раўнавагі ў мікракосмасе (чалавеку). Спосабы лячэння як узнаўленне страчанай гармоніі.

*Воспа*. Знешні выгляд. Спосаб уздзеяння на чалавека.

*Ліхаманка*. Назвы хваробы ў розных дыялектах (трасца, хіндзя, шуня, фыбра і інш.). Знешні выгляд. Уяўленні пра мноства сясцёр-ліхаманак. Спосаб авалодання ахвяраю. Абярэгі ад ліхаманкі. Лячэнне. Замовы ад ліхаманкі.

*Халера*. Розныя вобразы халеры. Спосабы заражэння людзей. Абярэгі: раскладванне агню, выраб ручніка-абыдзённіка.

*Чума*. Назвы хваробы ў розных дыялектах (мор, мара, чорна немач і інш.). Розныя вобразы чумы.

*Падвей* – хвароба ў выглядзе віхру. Абярэгі ад падвею.

### *Тэма 28. Дэманічныя істоты, якія маюць часткова чалавечую прыроду: вупыр*

*Вупыр* – нябожчык, які чыніць шкоду людзям і свойскай жывёле. Этымалогія назвы. Знешнія прыкметы. Спосабы ўбачыць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вупыра. Катэгорыі людзей, якія пераўтвараліся ў вупыроў. Абярэгі ад вупыра.

### *Тэма 29. Дэманічныя істоты, якія маюць часткова чалавечую прыроду: ваўкалак*

*Ваўкалак* – чалавек, пераўтвораны ў ваўка. Віды ваўкалакаў. Спосабы пераўтварэння ў ваўкалака. Спосабы вяртання ў чалавечы выгляд. Знешні выгляд ваўкалака паводле народных уяўленняў. Паводзіны ваўкалакаў у адрозненне ад паводзін ваўкоў. Спачувальныя адносіны людзей да ваўкалакаў-ахвяр.

### *Тэма 30. Хтанічны свет*

*Вуж*. Сувязь вужоў з вадой. Нябеснае паходжанне архетыпа вужа: асацыятыўнае падабенства вужа і маланкі. Выява вужоў у аздабленні хаты. Культ вужоў у беларусаў. Месцазнаходжанне вужа ў хаце. Назвы вужоў. Сувязь архетыпа вужа з культам продкаў. Вобраз вужа ў чарадзейных казках з сюжэтам «муж-вуж». Павер'і, звязаныя са святам Узвіжання. Уяўленні пра «змяіны вырай» і «змяінага цара».

*Гадзюка*. Адмоўнае значэнне гадзюкі (змяі) у беларускім фальклоры. Змеі як абярэгі на выявах прадметаў у трыпольскі перыяд. Веснавое і восеньскае змяіныя святы. Народныя спосабы лячэння ад укусаў гадзюкі. Замовы ад змяі. Псаванне чалавека ведзьмакамі пры дапамозе гадзюкі. Час найбольшай актывізацыі змей. Уяўленні пра царэўну-гадзюку. Беларускія павер'і пра свечку, выробленую з гадзюкі. Старажытныя амулеты са змяіных галоў. Народныя лекі, выробленыя са спаленай скуры змяі. Павер'і пра «змяіныя травы».

### *Тэма 31. Міфалагічныя матывы ў мастацкай культуры Беларусі*

Міф у творчасці А. Міцкевіча. Паэма «Свіцязянка». Паэма «Дзяды» – язычніцка-міфалагічныя ўяўленні беларусаў, звязаныя з шанаваннем продкаў. «Шляхціц Завальня» Яна Баршчэўскага – аўтарская інтэрпрэтацыя беларускіх міфаў.

Міфалагічныя сюжэты і персанажы ў творчасці празаікаў і паэтаў сярэдзіны і другой паловы XIX ст. – В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, А. Абуховіча, Я. Лучыны.

Міфалагічнае бачанне свету ў творчасці паэтаў пачатку XX ст. Творы Ядвігіна Ш. «Дуб-дзядуля», «Чалавек». Вобразы ніжэй-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шай міфалогіі ў творчасці М. Багдановіча. Традыцыі, уяўленні і аўтарскае бачанне («Лясун», «Падвей», «Вадзянік», «Русалка», «Возера», «Срэбны змей» і інш.). Міфалагічныя вобразы ў творчасці Я. Купалы («Чорны бог», «На Купалле», «Заклятая кветка»). Адухаўленне прыроды ў «Казках жыцця» Я. Коласа.

Адлюстраванне язычніцкага светапогляду ў сучаснай беларускай літаратуры (Р. Барадулін, В. Іпатава, А. Мінкін, А. Сыс, А. Глобус, М. Скобла і інш.).

Язычніцкія матывы ў выяўленчым мастацтве Беларусі XIX–XX стст.

Гістарычныя кампазіцыі, якія адлюстроўваюць дахрысціянскі перыяд у творчасці мастака К. Альхімовіча (карціны «Язычніцкія жрацы», «Апошні жрэц Літвы з дачкой Плёнтай»). Асэнсаванне вобраза Ярылы як сімвала нацыянальнага адраджэння ў карціне Я. Драздовіча «Пагоня Ярылы».

Міфалагічныя сімвалы каляндарных абрадаў, адлюстраваныя ў творах М. Філіповіча «На Купалле», «Вясновае свята. Карагод».

Міфалагічныя вобразы, створаныя майстрамі ілюстрацый кніг (мастакі М. Селяшчук, В. Славук і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Зайкоўскі, Э. М.* Жыватворныя крыніцы Беларусі / Э. М. Зайкоўскі, Л. У. Дучыц. – Мінск : Ураджай, 2001. – 111 с. : іл.

2. *Зямная* дарога ў вырай : Беларускія народныя прыкметы і павер’і / уклад. У. А. Васілевіч. – Мінск : Мастац. літ., 1994. – Кн. 3. – 656 с.

3. *Зямля* стаіць пасярод свету… : Беларускія народныя прыкметы і павер’і / уклад. У. А. Васілевіч. – Мінск : Мастац. літ., 1996. – Кн. 1. – 591 с. : іл.

4. *Жыцця* адвечны лад : Беларускія народныя прыкметы і павер’і / уклад., прадм., пер. У. Васілевіча. – Мінск : Мастац. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.

5. *Коваль, У. І.* Народныя ўяўленні, павер’і і прыкметы : даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі / У. І. Коваль. – Гомель : Агенцтва навук.-тэхн. і дзелавой інфармацыі, 1995. – 180 с.

6. *Міфалогія.* Духоўныя вершы / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы / А. М. Ненадавец, А. У. Марозаў, Л. М. Салавей, Т. А. Івахненка; навук. рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 471 с. – (Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка; кн. 5).

7. *Міфалогія* беларусаў : энцыкл. слоўнік / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с. : іл.

8. *Мифы* народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М. : Сов. энцикл., 1991. – Т. 1. – 671 с. : ил. ; Т. 2, 1992. – 719 с. : ил.

9. *Ненадавец, А. М.* Сілаю слова : Чорная і белая магія / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь, 2000. – 350 с.

10. *Тайлор, Э. Б.* Первобытная культура : пер. с англ. / Э. Б. Тайлор. – М. : Политиздат, 1989. – 573 с.

11. *Фрэзер, Д. Д.* Золотая ветвь : пер. с англ. / Д. Д. Фрэзер. – 2-е изд. / послесл. С. А. Токарева. – М. : Политиздат, 1983. – 703 с. – ( Б-ка атеист. лит.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. *Антонян, Ю. М.* Миф и вечность / Ю. М. Антонян. – М. : Логос, 2001. – 463 с.

2. *Арлоў, У. А.* Таямніцы Полацкай гісторыі / У. А. Арлоў. – Мінск : Полымя, 2002. – С. 5–44.

3. *Афанасьев, А.* Поэтические воззрения славян на природу : опыт сравнит. изуч. славян. преданий и верований в связи с мифич. сказаниями др. родств. народов : в 3 т. / А. Афанасьев. – М. : Соврем. писатель, 1995. – Т. 1. – 412 с. ; Т. 2. – 397 с. ; Т. 3. – 415 с.

4. *Богданович, А.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: этногр. очерк / А. Богданович. – Минск : Беларусь, 1995. – 186 с.

5. *Бирлайн, Д. Ф.* Параллельная мифология / Д. Ф. Бирлайн. – М. : Крон-Пресс, 1997. – 333 с.

6. *Валодзіна, Т. В.* Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т. В. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 1999. – 167 с.

7. *Воеводина, Л. Н.* Мифология и культура / Л. Н. Воеводина. – М. : Ин-т общегуманит. исслед., 2002. – 355, [1] с.

8. *Волошина, Т. А.* Языческая мифология славян / Т. А. Волошина, С. Н. Астапов. – Ростов н/Д : Феникс, 1996. – 445 с.

9. *Ермаловіч, М.* Старажытная Беларусь : Полацкі і Навагародскі перыяды / М. Ермаловіч. – Мінск : Мастац. літ., 1990. – С. 67–82.

10. *Ляўкоў, Э. А.* Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э. А. Ляўкоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 213 с. : іл.

11. *Ненадавец, А. М.* За смугою міфа / А. М. Ненадавец; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 254 с.

12. *Памяць* : Заслаўе : гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і рэгіёнаў Беларусі / уклад. Н. В. Мартынава; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – С. 53–54.

13. *Рыбаков, Б. А.* Язычество древних славян / Б. А. Рыбаков. – М. : Наука, 1981. – 607 с.

14. *Рыбаков, Б. А.* Язычество Древней Руси / Б. А. Рыбаков. – М. : Наука, 1987. – 784 с.

15. *Славянские* древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под ред. Н. И. Толстого / Рос. АН, Ин-т славяноведения

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

и балканистики. – М. : Междунар. отношения, 1995. – Т. 1. – 578 с. ; Т. 2, 1999. – 697, [2] с. ; – Т. 3, 2004. – 697, [1] с.

*16. Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с. : іл.

*17. Сержпутоўскі, А. К.* Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1999. – 191 с. : іл.

*18. Сысоў, У. М.* З крыніц спрадвечных / У. М. Сысоў. – Мінск : Выш. шк., 1997. – 415 с. : іл.

*19. Шамякіна, Т. І.* Міфалогія Беларусі : нарысы : вучэб. дапам. / Т. І. Шамякіна. – Мінск : Мастац. літ., 2000. – 398, [1] с. : іл.

*20. Элиаде, М.* Аспекты мифа / М. Элиаде. – М. : Инвест-ППП, 1995. – 238, [1] с.

*21. Юдин, А. В.* Русская народная духовная культура : учеб. пособие / А. В. Юдин. – М. : Высш. шк., 1999. – 330, [1] с.
РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

| Балы | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| **1 (адзін)** | Адсутнасць кампетэнтнасці ў межах вывучаемай дысцыпліны, адмаўленне ад адказу |
| **2 (два)** | Фрагментарныя веды асобных фактаў і тэрмінаў дысцыпліны |
| **3 (тры)** | Недастаткова поўны аб'ём ведаў, аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу |
| **4 (чатыры)** | Дастатковы аб'ём ведаў у рамках агульнаадукацыйнага стандарту; засваенне асноўнай літаратуры; адсутнасць сістэмнага ўсведамлення ў вывучэнні пытанняў міфалогіі |
| **5 (пяць)** | Дастатковыя веды ў рамках вучэбнай праграмы; веданне большай часткі пытанняў і тэарэтычных паняццяў міфалогіі. Наяўнасць неістотных памылак |
| **6 (шэсць)** | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы. Веданне асноўнай навуковай літаратуры па дысцыпліне |
| **7 (сем)** | Трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё сутнасці з'яў міфалогіі |
| **8 (восем)** | Поўныя, глыбокія веды. Свабоднае валоданне вучэбным матэрыялам. Сістэмнае веданне генезісу з'яў міфалогіі |
| **9 (дзевяць)** | Сістэматызаваныя, глыбокія і трывалыя веды. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў міфалогіі. Уменне аналізаваць з'явы з улікам ведаў па гісторыі, літаратуры, мовазнаўстве. Наяўнасць адзінкавых неістотных недакладнасцей |
| **10 (дзесяць)** | Глыбокае і поўнае асэнсаванне з'яў міфалогіі. Разуменне агульнатэарэтычных пытанняў і актуальных праблем навукі. Уменне аналізаваць з'явы ў шырокім культурным кантэксце і практычна прымяняць свае веды ў межах прафесійнай дзейнасці |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Дыягностыка кампетэнцый студэнта

Ацэнка і дыягностыка дасягненняў студэнтаў выконваецца паэтапна, уключаючы апытанне на практычных занятках па пэўных раздзелах вучэбнай дысцыпліны і выніковы кантроль у форме заліку і экзамену.

*Вучэбнае выданне*

**МІФАЛОГІЯ**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для ўстаноў вышэйшай адукацыі*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках),напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная*
*творчасць (фальклор)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 0,92. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ